Жыве Беларусь!

Народная газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№85 (850) 14—16 мая 1994 г. Субота—панядзелак. Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. Тыраж 624505 экз. Кошт у розніцу — 100 руб.

ФАКС

Вкратце

Договор о сотрудничестве в области культуры между Республикой Беларусь и Словацкой Республикой подписан в Минске.

С белорусской стороны его подписал министр культуры и печати Республики Беларусь Анатолий Бутевич, со словацкой — министр культуры Любо Роман.

❑

15 мая теперь будет отмечаться, по решению Генеральной Ассамблеи ООН, как Международный день семьи.

Совет Министров Беларуси также принял постановление, в котором исполкомам местных Советов, министерствам и ведомствам, предприятиям, учреждениям и организациям рекомендуется ежегодно проводить 15 мая мероприятия, посвященные Международному дню семьи.

❑

Совет Министров республики принял постановление "О размерах пособий и доплат населению, которое пострадало в результате катастрофы на Чернобыльской АЭС".

В частности, для усиления социальной защиты этим документом предусматривается уже с 1 апреля ежемесячная денежная помощь в размере 6500 рублей каждому члену семьи в зоне проживания с периодическим радиационным контролем, в зоне с правом на отселение — 8500, а в зонах последующего и первоочередного отселения — 13.000 рублей.

❑

Визит премьер-министра России Виктора Черномырдина в Латвию должен состояться до конца мая.

Во время визита российского премьер-министра в Латвию предполагается подписание российско-латвийского договора о свободной торговле.

❑

Фракция Либерально-демократической партии России в Государственной думе решила подготовить законопроект о введении в Москве особого положения.

За время его действия, по мнению ЛДПР, правительство Москвы "могло бы, опираясь на правоохранительные органы, очистить Москву от общественно опасных и криминальных элементов из числа приезжих".

❑

Вчера исполнилось 3 года со дня образования Всероссийской государственной телерадиокомпании.

"Кина" не будет?

Все меньше зрителей становится в кинотеатрах Витебщины. На днях закрылся "Восток" — один из старейших кинотеатров областного центра.

Это уже третий городской кинозал, прекративший работу в результате дороговизны билетов и неравной борьбы с телесериалами. С начала года ПО "Киновидеопрокат" закупило всего три фильма. Единственная пока надежда на спасение — договор со смоленским "Киновидеосервисом" об обмене фильмами, на покупку которых российским соседям выделяется в десять раз больше средств, чем витебским прокатчикам.

Сергей ДВИНСКИЙ.

Как бальзам на душу...

Еще один оригинальный рецепт разработали специалисты Брестского ликеро-водочного завода.

Следом за пришедшейся по вкусу водкой "Беларусь" уже в текущем году на прилавки поступит бальзам "Брестский". В состав горячительного напитка входят ингредиенты 30 трав из Беловежской пущи. Вполне возможно, что появление бальзама на мировом рынке принесет заводу еще одну Золотую звезду качества.

Валентина КОЗЛОВИЧ.

Магазины, магазины, а я бедненький такой

Несмотря на перебои с товарами, количество крупных предприятий торговли в Витебске продолжает расти.

На днях жители восточной окраины города получили долгожданный продовольственный универсам. Его площадь — более тысячи квадратных метров. На финишную прямую выходит и строительство просторного гастронома торговой фирмы "Веста" в южной части Витебска.

Кстати, с продуктами, в отличие от промтоваров, в городе сейчас довольно благополучно. Отчасти, конечно, потому, что цены далеко не всем доступны.

Сергей КОРОБЕЙНИКОВ.

Орудия преступления — топор и лопата

В правоохранительные органы Бобруйска обратилась пенсионерка Е., которая заявила, что после двухдневного отсутствия дома она нашла свою квартиру обворованной.

Пропал и ее сын Б. — учитель физкультуры одной из школ Бобруйска. В ходе следствия по подозрению в краже был задержан нигде не работающий гражданин Украины. Выяснилось, что именно он был в гостях у пропавшего учителя в злополучный вечер. После застолья внезапно возникла ссора, во время которой гость схватил топор и, ударив Б. по голове, убил его. С целью сокрытия преступления тем же способом он убил и спавшего в доме еще одного учителя той же школы. Трупы были закопаны им во дворе дома.

Дмитрий КУРАСОВ.

Никто не забыт

Всего 67 ветеранов освобождавшей Березу 48-й гвардейской стрелковой дивизии сохранило время.

Всем им отправлены сердечные поздравления с приглашением посетить город в дни посвященных 50-летию освобождения Белоруссии торжеств. Расходы по пребыванию гостей местные власти берут на себя.

Виктор ВАСИЛЬЕВ.

Памяти Кирилла Туровского

В древнем Турове прошел день памяти философа и просветителя, епископа Кирилла Туровского.

Начался он торжественным богослужением в местной церкви с участием митрополита Минского и Слуцкого Филарета.

Из храма был совершен крестный ход на Замковую гору, где состоялись собрание и концерт художественной самодеятельности представителей Житковичского, Лельчицкого и Столинского районов — территорий, которые в древние времена входили в состав Туровского княжества.

Анатолий ИВАНОВ.

Растет БНФ на Витебщине

В Витебске зарегистрирована областная рада БНФ во главе с Язэпом Дулебой.

Учредительная конференция рады состоялась еще в феврале. Ранее в области была только витебская городская организация Белорусского народного фронта.

Степан СТАРОЖИЛ.

Новое поколение выбирает

В списках брестской инспекции по делам несовершеннолетних — пополнение.


Группа учащихся СШ N13 при посещении Музея Брестской крепости умудрилась свинтить орден Ленина с экспозиционного френча героя-защитника. Смотрительницы заметили и успели поднять тревогу — юнцов задержали на выходе. По объяснениям школьников, при удачном исходе подвиг был бы оценен в 50 долларов, обещанных взрослыми парнями. Кстати, похищенный орден был лишь муляжем.

Василий ВИКТОРОВИЧ.

Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты", агентств ИТАР—ТАСС, Белинформ, Интерфакс, БелаПАН.

Бенефіс

Каб павіншаваць велічную Стэфанію Міхайлаўну Станюту з юбілеем, самому прэм'ер-міністру рэспублікі давялося пастаяць у чарзе



І быў дзень — 12 мая 1994 года. І быў вечар у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. Давалі спектакль "Гаральд і Мод". На сцэне валадарыла велічная Стэфанія Станюта. Рэспубліка адзначала 75-годдзе яе сцэнічнай дзейнасці.

Напэўна, быў загадзя, да драбніц распрацаваны сцэнарый бенефіса. І, вядома, арганізатары хацелі правесці цырымонію віншавання як мага больш урачыста і святочна. Але ўсе планы рухнулі пад авацыямі, не, хутчэй, пад лікаваннем залы! Гэта быў адзіны грандыёзны душэўны парыў сотняў людзей, якія прыйшлі павіншаваць Станюту. Нашу Станюту...

Па высакароднасці, пафасу, па вышыні і напалу пачуццяў, якія панавалі ў гэты момант, я ўпэўнена, кожны, хто стаяў у зале, успрымаў гэтыя хвіліны як абсалютна ні з чым не параўнальныя. Ды і не дадзена чалавеку ў паўсядзённым жыцці перажываць такі ачышчальны душу ўздым. На гэта здольна навесці яго толькі Мастацтва...

Як толькі Стэфанія Міхайлаўна выйшла на першы паклон публіцы пасля спектакля, на сцэну да яе сталі падымацца дзесяткі гледачоў з букетамі руж, цюльпанаў, гіяцынтаў і гваздзікоў. Праз некалькі хвілін актрыса стаяла ў моры кветак, яна ў іх патанала. А людзі ўсё ішлі і ішлі — падзякаваць, пакланіцца, пацалаваць руку вялікай актрысе і жанчыне. Прайшло дзесяць, пятнаццаць, дваццаць пяць мінут, а пачаць пратакольную частку бенефіса проста не было магчымасці. Напэўна, гэта быў першы і апошні раз, калі Вячаслаў Францавіч Кебіч стаяў і чакаў сваёй чаргі. Як, зрэшты, і іншыя афіцыйныя асобы — намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета Уладзімір Васільевіч Русакевіч, міністр культуры, старшыня Саюза тэатральных дзеячаў, галоўны рэжысёр... Першымі на гэты раз былі не яны, а простыя гледачы. Зрэшты, хіба магло быць інакш на юбілеі ў Стэфаніі Станюты?!

Колькі сказана, колькі напісана пра гэтую славутую актрысу, а ўсё роўна шукаеш новыя словы і вобразы, каб дакладней вызначыць яе месца ў нашым грамадстве і жыцці. Я думаю, што Стэфанія Міхайлаўна Станюта — гэта жывы сімвал беларускай нацыі. Адзін з тых сімвалаў, дакрануўшыся да якога, чалавек становіцца асобай, нацыя — публікай, маса — народам. Мы любім Станюту таму, што яна робіць нас лепшымі. Менавіта за гэта, дакладней, усведамляючы гэта як ніколі, публіка апладзіравала вялікай Стэфаніі, не ведаючы, як інакш выказаць сваю ўдзячнасць і захапленне талентам. Многія леты Вам, Стэфанія Міхайлаўна!

Алена МАЛОЧКА.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Власть и народ

Зачем премьеру подписи? Кандидатом в президенты его уже сделал А.Моисеев

Анатолий ГОТОВЧИЦ

Чем ближе президентские выборы, тем больше всевозможных сюрпризов. Как заметил лирик, удивляйтесь, люди, удивляйтесь.

Из Буда-Кошелево пришло известие следующего характера: местные власти применили хорошо известную в былые времена разнарядку по сбору подписей за премьер-министра В.Кебича. Цифирь доведена до председателей сельских Советов. Координирует "обязаловку" заместитель председателя райисполкома — начальник управления по экономике, рыночным отношениям и социальной защите населения В.Хандакова.

На гомельском объединении "Коралл" начальники цехов с подачи руководства предложили-обязали являться на работу с паспортами, чтобы "ковать железо, пока горячо". Разумеется, в поддержку премьер-министра. В противном случае якобы могут появиться трудности с работой.

В Калинковичах тоже оригинальничают. Работница автобазы №5 Л.Киселева 26 апреля на служебной "Волге" с самого утра явилась в местную редакцию, чтобы собрать подписи за премьер-министра.

Но, пожалуй, больше всех удивил заместитель председателя Петриковского райсовета Александр Моисеев — член инициативной группы в поддержку того же Кебича. Когда в один из дней вместе с коллегой мы поднялись на второй этаж здания райисполкома, то увидели на информационной доске добротную листовку: "Вячеслав Кебич — кандидат в президенты Республики Беларусь".

Смотрится листовка неплохо, и ясно, что сработана она централизованно: точно такой снимок на следующий день поместила на первой полосе газета "Рэспубліка"...

— Роздал я такие листовки, — похвалился А.Моисеев, — всем сельским Советам.

Спохватился Александр Федорович, когда мы попросили экземплярчик "на память". Почему-то вдруг листовок у него не оказалось. Впрочем, "не нашли" их и некоторые другие работники райисполкома.

Догадываетесь, почему? Конечно же, грубо нарушен Закон о выборах президента Республики Беларусь, в частности его статьи 23—25, 28.

Пока В.Кебич не зарегистрирован как кандидат Центральной комиссией по выборам президента. Рановато еще.

В Петрикове же Александр Моисеев уже сделал В.Кебича таковым. Так зачем тогда эти труды-хлопоты с "разнарядкой", сбором подписей в рабочих коллективах? Пусть уж петриковцы и иже с ними сразу обязуют Центральную комиссию зарегистрировать вышеозначенного претендента кандидатом (или лучше президентом), да и дело с концом.

О них сегодня говорят

Одно мгновение весны, или Как акционерное общество "Амкодор" проторило еще одну дорогу

Алесь СИВЫЙ

— Совет директоров проходит, — проинформировала нас вахтерша вышеназванного общества и добавила: — Сейчас будут автобус выкатывать...

По этому поводу, собственно, и был затеян наш журналистский "десант", который завершился массовым фотообстрелом директоров, автобуса и... взятием в репортерский плен президента АО "Амкодор" Василия Михайловича Шлындикова.

Так что же, собственно, произошло? Из-за чего разгорелся сыр-бор? А дело вот в чем — в Беларуси выпущены первые два автобуса "Икарус". Нет, мы не оговорились, именно "Икарусы" рождены "Амкодором".

Примерно полтора года тому назад президент АО "Амкодор" В.М.Шлындиков набрал будапештский телефон тамошнего предприятия "Икарус" и изложил свои планы на сотрудничество по выпуску их автобусов у нас в республике. Венгры заинтересовались. Последующая цепочка развития событий была по-рабочему проста — переговоры, принятие решения о таком сотрудничестве, конкретная работа. Из Будапешта в Минск начали доставлять комлектующие части, приехали и опытные специалисты, которые с корабля да прямо на "балу" взялись за обучение белорусских специалистов премудростям дела. Все тонкости этого кропотливого процесса вряд ли стоит описывать, а вот о практической пользе выпуска в Беларуси "своих" "Икарусов" сказать стоит.

Какая у нашего государства казна, кажется, знают все. Откуда взять валюту на закупку тех же автобусов у венгров? И все знают, что старенькие (желтенькие) уже давно прохудились и не ровен час, что нам пришлось бы через некоторое время похоронить их как некогда динозавров. А здесь пожалуйста — и цены ниже, и детали без проблем, да и что ни говорите — авторитет. Не только фирмы, но и республики. Только в этом году планируется выпустить у нас около 30 таких автобусов-красавцев (дизайн на самом деле очень хорош) и начать "запуск" в производство мини-грузовиков и джипов. Кстати, завод по выпуску всей перечисленной техники будет находиться в Пинске, где "Амкодор" имеет свою производственную базу.

...Президент АО "Амкодор" любовно осматривал свое детище, когда мы обратились к нему с вопросами.

— Василий Михайлович, ваши планы сбылись?

— Нет. Это только начало...

— И все-таки начало удачное.

— Может быть, хотя я хочу поблагодарить всех, кто принимал участие в разработке этого проекта.

— Помощь со стороны нашего правительства была?

— Я бы сказал так — они нам не мешали в работе. А сейчас вроде даже обещают и конкретную помощь.

— Василий Михайлович, вы рисковый человек?

— Я всегда говорил: "Вся жизнь — один большой риск. Умный человек по мере возможностей повышает свои шансы на победу".



❑ *Президент АО "Амкодор" В.М.Шлындиков (слева) и генеральный директор АО "Амкодор—Пинск" М.И.Парепко у своего детища.*

Фото Марии ЖИЛИНСКОЙ.

З першых вуснаў

В.КЕБІЧ:

"Трэба аб'яднацца ў імя інтарэсаў народа"

12 мая ў Белдзяржуніверсітэце адбылася сустрэча прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Вячаслава Кебіча з прафесарска-выкладчыцкім саставам шэрагу беларускіх ВНУ.

"Новай незалежнай Беларусі неабходны фундаментальныя пераўтварэнні ў галіне навукі для дасягнення высокага еўрапейскага ўзроўню", - падкрэсліў у сваім выступленні прэм'ер-міністр. Паводле яго слоў, "сёння галоўнай задачай з'яўляецца стварэнне адзінай сістэмы падрыхтоўкі нацыянальных інтэлектуальных кадраў сусветнага ўзроўню на аснове дасягненняў у галіне фундаментальных навук". Прэм'ер паведаміў аб выдзяленні ВНУ на навуковыя распрацоўкі дадатковых сродкаў у некалькі мільярдаў рублёў. В.Кебіч бачыць таксама магчымасць дапамагчы беларускай навуцы за кошт выкарыстання часткі сродкаў крэдытаў МВФ і крэдытных ліній, якія прадстаўлены замежнымі банкамі.

Гаворачы аб сваім разуменні ролі першага прэзідэнта Беларусі, Старшыня Савета Міністраў адзначыў, што, у прыватнасці, ён бачыць яе ў аб'яднанні ўсіх палітычных сіл, партый і рухаў у імя інтарэсаў народа. Ен таксама лічыць, што беларускаму народу не пражыць без дружбы з Расіяй, таму патрэбны прэзідэнт, здольны як роўны ад імя народа весці дыялог з Расіяй.

Ларыса КЛЮЧНІКАВА,
Белінфарм.

Дыскусійная трыбуна

27 красавіка 1994 года былі надрукаваны лісты дэпутатаў Рэспублікі Беларусь І.Някрасава і В.Сарокіна, у якіх аўтары прадоўжылі дыскусію са сваім калегам па парламенцкаму корпусу, народным паэтам Беларусі Н.Гілевічам.

Як і можна было чакаць, хлынула пошта. Сённяшняя падборка — гэта толькі невялікая частка лістоў-водгукаў на артыкулы І.Някрасава і В.Сарокіна.

Хто распальвае варожасць?

Многіх палохае не нацыяналізм і яго праяўленні, з гэтым ніякіх змагацца. На Беларусі ніколі не было пагромаў накштальт "бі жыдоў — ратуй Расію". Палохае пэўныя колы рост нацыянальнай свядомасці. Беларус пачынае абуджацца, азірацца і бачыць, хто ж у доме гаспадар, што ён нічым не горшы за палякаў, французаў, рускага і г.д. Бояць страціць бязмежнае і бескантрольнае пананаванне ў тых, у каго ёсць запасная радзіма, якія ў няспраўных для іх час хутка знаходзяць там прытулак, агаляючы цэлыя галіны навукі і прамысловасці Беларусі. Таму і ўзнімаецца не беларусамі, а імі хваля так званага нацыяналізму.

Дэпутатаў Вярхоўнага Савета Валянціна Сарокіна і Ігара Някрасава не цікавіць сутнасць паняцця "нацыяналізм". Якая розніца паміж нацыстам і нацыяналістам, расістам, патрыётам і шавіністам, нацыяй і народам? Склалася ўражанне, што яны гэтага не разумеюць.

Наіўна меркаваць, што гістарычныя факты пасеюць варожасць паміж рускімі і беларусамі. Калі мы святкуем перамогу над фашызмам, то гэта не ганьбіць сённяшніх немцаў. Не зневажаюць жа і паездкі немцаў на экскурсіі ў Хатынь. Не зневажае ж татараў святкаванне ўгодкаў Куліковскай бітвы, а французаў — Барадзінскай. Біліся не нацыі, а народы. А калі б'юцца народы — гэта называецца вайной, казаў вядомы Казьма Прутков.

Вайна ў мяне ў пячонках ужо, хоць я і пасляваенны. З дзяцінства ўсё вайна, вайна, вайна. Кіно — пра вайну, гульні — у вайну ("нашых" і "немцаў"), цацкі — танкі, пісталеты, гарматы, шаблі і г.д. Але немец не стаў ворагам. Няўжо паважаныя Сарокін лічыць беларусаў такімі дурнямі, якія не разумеюць, што рускія ні ў чым не вінаватыя? Вінавата сістэма (не важна якая — царская ці бальшавіцкая), не правадыры. Пад выглядам вызвалення, дапамогі фактычна было створана ўмовы для цiхай акупацыі. Эканоміка цалкам залежыць ад суседняй дзяржавы, мова амаль што цалкам знішчана — вось далёка не ўсе прыкметы не вызвалення. А ў Леніна ўсё не так маркавалася. Раю пачытаць Сарокіну і Някрасаву што Ленін пісаў, каб зразумець сэнс "самавызначэння нацый аж да самога аддзялення", "аб рускай дзяржымордзе", аб тым, каб руская мова не стала пануючай у нацыянальных краінах Саюза. Каб его ідэі сапраўды здзейсніліся, дык ці была б неабходнасць сёння спрачацца з сарокінымі і някрасавымі наконт за самое паняцце "адраджэнне".

Пан Сарокін, пэўна, цывілізаваны чалавек. Але к чаму тон і адносіны да апанента такія варожыя, зневажлівыя? Піша па-руску, а беларускім выразам "спадар" падкрэслівае Гілевіча як нацыяналіста. Таму і я не для здзеку выкарыстоўваю зварот "гаспадзін", а каб прымусіць задумацца, што з такой формы адносін нічога людскага не атрымаецца. Дык хто ж распальвае варожасць?

Пляўок у твар атрымаў не толькі прадстаўнік культуры майго народа, а і я як народ. Пані Сарокіна, пішучы па-руску, да беларускіх выразаў "спадар" сваю лёгка, але для чаму "Пан Сарокін" спадар свайго лёсу, свайго народа, — мышцаў і думак. Як казалі калісьці на Русі, "изволил б, сударь, извинится". Плюцце ж у студню.

"Россия добровольно передала в состав Беларуси ... спорные территории..." Хлусня. Пан Сарокін! Не перадала, а вярнула: улоўліваеце розніцу?

"Никто, в том числе и я, не выступает против белорусского языка. Наоборот... поддерживаем...", — піша Сарокін. Выбачце, але ці гэта не крывадушнічаць?! Раю ўважліва прачытаць "Азбуку" ці больш "усе выбаркі", а таксама з Канстытуцыі Рэспублікі, таму, што на знешне "язык", а з гісторыяй ды рэальнымі справамі мову — складана пытанне ...

Раю назваць нашу мову (не важна якая — царская ці бальшавіцкая)...

Так, напрыклад, адмоўную дэпутату і яго прапанову на тэме Някрасава зварнуўшы ў газету "Советская Белоруссия" да таварыша Матково, які, як кажуць, сабаку з'еў на падрыхтоўцы матэрыялаў накшталт антыдзяржаўнасці беларускай, усялякіх "доказаў" не ніягрубчаюць, дзялектаў рускай мовы. Амаль тое ж — у "Рэспубліцы", у "Беларускім часе". А чым жа падтрымаў Сарокін мову? Уласным прыкладам? Не як паліччыць за званку да мовы яго цытату: "Белорусская **мова** может стать непреодолимой преградой..." Заўважаеце? Не язык, а мова.

"Почему не находится места для русского языка, но котором, так уже исторически сложилось, разговаривает большинство населения республики?" Хлусня. Яна "исторически сложилось", мы ведаем. Не "сложилось", пан Сарокін, — гвалтоўна тое запатэлі (не вашага ці бацькоў), але і я бусай прыцягнуць вучоб пасля беларускай школы. О, колькі здзекаў і кпінаў вытрымаў! А калісьці ж было выкладанне ў ВНУ па-беларуску, было беларускамоўнае справаводства.

У чым "не праў" Ніл Гілевіч на думку Сарокіна і чаму "не может молчать" былы партызан Някрасаў, мне зразумела. Хваляе пераследваваць: ці зразумеюць простыя людзі? Не дай Бог, каб народ і бацькі ведалі нашы "господа", зноўдуцца і зьнішчыць справядлівае паэта, выразіць ўсё думак і мар свайго народа.

Мікола ЛАВІЦКІ,
старшыня рэвізійнай камісіі ТБМ імя Ф.Скарыны Рэспублікі Беларусь.

Будучыня Беларусі не за вамі, шаноўныя...

Дзень добры, шаноўная рэдакцыя!

Абурэнне, горыч, пратэст, крыўда — цэлую гаму адмоўных эмоцый і пачуццяў выклікала ў мяне газетная публікацыя артыкулаў "товарищей народных депутатов" І.Някрасава "Не могу молчать" і В.Сарокіна "Вы не правы!". Вось жа, калі гэта апраўдаць, нельга заставацца раўнадушным, калі гэтулькі непрыхаванай нянавісці выказваецца ў адрас гарачых беларусаў, нашай маладой незалежнай дзяржавы. Выпадзеў тай жа злосці яны праклінаць не сапраўдных сыноў і дачок накрыўшы піша па ўсім. Абаранны паважаныя рэплікі партызанскай інтэрэсы і краіны наша, якія лічацца ўсяго толькі гістарычны тэр, ніякія знойдзе, з ясных, ні былыя — палаюць і ў свае прыклады і сябе сацыяльную, хлусня, за ворагаў "выдуманы", якія хацелі б з усяго свету знішчыць беларускую мову і жывую мову нашу рэальнай. Гэта жудасна і напаўнае зразумелыя, тыя нашы і пра ўсю нашу гісторыю, гэта сведка падзей і наша вечная прыгадваем ...

Гэта толькі адзін прыклад таго, якімі прыёмамі карыстаюцца аўтары вышэйназваных публікацый. Няма асаблівага патрэбы ў публікацыях правалілі астатнія "ўзоры" артыкулаў І.Някрасава і В.Сарокіна, там шмат грубу выцягу на многія старонкі нашага мінулага і сённяшняга жыцця. Пытанне: як яны ўсё сапраўды падобнае пасталі на такіх людзях "товарищей народных депутатов"? Дарэчы, хто ім дае права на выказванне "народны" і "нацыянальна-свядомы" і "тыя, хто за правы, упэўнена "народных пісьменнікаў". Але ж, калі быць шчырым, ці ўсёй "народных пісьменнікаў" шчырыя словы, "Вы не правы" бумерангам вяртаецца да аўтара. Якраз менавіта вы і не маеце рацыі, ішчунну наш народ, у заснаванні Беларусі, "я" апеляваць з якімі "тымі" вы ...

Вось, напрыклад, што піша В.Сарокін: "... территории Беларусі в момент ее образования (1 января 1919 г.) (!!!) неизменно прежней площадь территорий, которые в то время входили в нынешние Минской области". А па чыёй віне была даведзена да такіх мізэрных памераў? Ці не расійскіх улад перадалі "Смаленшчыну", Віцебшчыну, Палаччыну, а расійскіх шырокіх, жыццёвых сацыяльных беларускіх тэрыторыі і землі? А так, нават і сам піша: "добровольно" передала в Беларусь. Вось дзякуй даброддзеям за такую ласку...

Гэта толькі адзін прыклад таго, якімі прыёмамі карыстаюцца аўтары вышэйназваных публікацый.

У гэтым сэнсе прыгадаюцца словы Гілевіча, таленавітага, патрыятычнага, правільнага беларускага паэта, які ў думках народа ўсіх часоў вартуе свабоды ў гісторыі ... ведае сапраўдную гісторыю нашага народа, якую нам пішуць з абразай: "Вы не правы!", бумерангам вяртаецца да аўтара. Якраз менавіта вы і не маеце рацыі, вашы на ўсе жывасці беларусы і ...

Так: "товарищи Сарокін і Някрасаў, нават калі нешта і не хоцелі ці не ўсе ўмелі ... Я і Ніл Гілевіч, і Зянон Пазьняк, і на якіх вы робіце стаўку, паважаны ў гісторыі Беларусі як пасланцы Бога, таленавітыя прадстаўнікі народа, яго лепшыя людзі, і ўсе тыя, хто вершыцца з праўдаю нашых сэнсаў, таленавітыя і ўсе беларускія сыны Беларусі ...

І ўсё ж я веру, што наша будучыня не за сарокінымі і някрасавымі, а ў роскваце нацыянальнай самасвядомасці. Жыве Беларусь!

Баляслаў ДУБРОЎСКІ.

г.Вілейка.

Ату іх!

Менавіта так успрымаецца злосліва-нахабны допіс нардэпа В.Сарокіна ("Народная газета", № 77 ад 27 красавіка). Увогуле на гэтыя шавіністычныя, хворыя развагі не было б сэнсу пісаць. Але лічу, што сумленным чытачам паважанай газеты трэба паведаміць аб жыццёва-рэальных беларускіх справах. Напрыклад, у Гомелі. Спроба распаліць варажнечу між гамяльчанамі розных нацыянальнасцей была. Зыходзіла яна не ад беларусаў. Колькі ляманту, звягі ў 1992 годзе выплеснулі таўкачы з руху "Адзінства і справядлівасць", "дарадцы" з кафедры расійскай мовы ГДУ імя Францыска Скарыны пры пераходзе на беларускую мову выкладання. Але ж дзякуючы вытрымцы беларусаў у горадзе зараз працуе 55 школ на роднай мове. Выхаванне на дзяржаўнай мове вядзецца ў 109 дзіцячых садках. Вось-вось адчыніць дзверы яўрэйскі садок-сад "Аціка" ("Надзея"). А гэты час не было скаргаў ад бацькоў на выхаванне і навучанне дзяцей. А што вы робіце, пан Сарокін, сваім артыкулам і публічнай дзеяй, падбухторваеце да варажнечы. Як можна народнаму дэпутату Рэспублікі Беларусь не прымаць дзяржаўны герб, дзяржаўны сцяг — святыні, якім мы пакланяемся? Як можна, пражываючы ў беларускай краіне, карыстаючыся рознымі прывілеямі, з пагардаю і нянавісцю адносіцца да беларускай мовы? А тым словам, што вы не супраць беларускай мовы, я не веру. Генерал Сарокін касавурыцца на Ніла Гілевіча, Анатоля Вярцінскага, Віктара Гайсёнка, Алега Трусава, Зянона Пазьняка і іншых рупліўцаў Адраджэння. Гэтыя спадары выражаюць сваімі дзеяннямі памкненні беларусаў. У іхняй ахвярнай працы няма ні кроплі зняваги да рускага люду, якому жылося і жывецца гэтак жа цяжка, як і нам. Толькі сумленныя расіяне прыйшлі да адраджэння беларусаў. Прывяду у прыклад маіх калег, дырэктараў школ Васіля Прата, Алену Мажар, Тамару Балака, Сяргея Тарыкава, Эдуарда Рыбакова і інш.

Лепей было б сарокіным не опусы пісаць, не ўздымаць гвалт у Вярхоўным Савеце, а далучыцца да прапановы рускай Ефрасінні Андрэевай і дапамагчы нам хутчэй адрадзіць сваю культуру, сапраўдную гісторыю. Тады б вам была наша падзяка. А так мы чакаем не дачакаемся, калі вы сыдзеце з палітычнай сцэны. Можа, тады ваша пенсіянерскае глумленне не будзе нам шкодзіць. Можа, тады слова "варажнеча" не будзе на нашых вуснах. А сёння, запэўніваю, мы ў крыўду сябе не дадзім. У нас Радзіма адна, і бараніць яе нам.

Алесь МІТКАВЕЦ,
метадыст Гомельскага гарадскога аддзела адукацыі, дэпутат гарсавета.

Беларусафобія — гэта хвароба, якую трэба лячыць

Перш чым сказаць галоўнае, мушу коратка спыніцца на некаторых момантах з артыкула "господина Сорокина" ў рубрыцы "Дискуссионная трибуна" ("Народная газета", 27.04.94 г.), у якім ён, трэба адразу сказаць, паказаў сябе недасведчаным апанентам, што недаравальна ў сур'ёзных дыскусіях, ды прытым дэпутату самага высокага органа. Вашы довады, прабачце, разлічаны на такую ж нізкую аўдыторыю.

Вось прыклады, што датычаць адукацыі. Пытаецеся: "Почему наряду с языком белорусским не находится места для русского?". Адказваю вашымі словамі: "Вы не правы!" Адкрыйце вучэбныя планы школ, нават не ранейшыя, а цяперашнія, яшчэ больш — нават не рускамоўных школ, у якіх вучыцца большая палова беларусаў (!), а з беларускай мовай навучання: "там везде наряду с языком белорусским находится место для русского!" Мала таго, параўнайце колькасць гадзін у перадвыпускным і выпускным класах:

	10-ы клас		11-ы клас	
	кампанентны			
	базавы	профільны	базавы	профільны
Беларуская мова	1	2	1	2
Беларуская літаратура	2	2/3	2	3/2
Руская мова	1	3/2	1	2/3
Руская літаратура	3	4	3	5
Сусветная літаратура	-	-	-	-
Замежная мова	2	3	2	3
Замежная літаратура	-	-	-	-

Калі ў вас адкрыліся вочы і вы сумленны чалавек, убачыўшы, што памыляліся (такое здараецца, калі не ўнікаеш у сутнасць справы, а карыстаешся павярхоўнымі ведамі і старымі поглядамі), то, можа, цяпер запатрабуеце ў Міністэрства адукацыі, каб больш увагі ўдзялялі беларускамоўнаму цыклу прадметаў. Як-ніяк, гэта ж нерускамоўная школа, выпускны клас, экзамен абітурыентам у ВНУ прыйдзецца здаваць абавязкова па беларускай мове, а не па рускай. Дзе логіка?

Не атрымалася нешта ў вас з лічбамі. Давайце паглядзім іншыя. Пытаецеся: "В какую сумму для бюджета абходится налогоплательщикам программа "Адраджэнне"?" Адказ: значна менш, чым сродкі на супрацьлеглыя мерапрыемствы пад умоўнай назвай "Русіфікацыя". Давайце тут абыдземся без нудных лічбаў, бо яны часта прыводзіліся афіцыйнымі асобамі. Маецца на ўвазе: колькі ў суверэннай Беларусі выходзіць кніг, перыёдыкі на расійскай і на дзяржаўнай мовах. Тут, бачыце, зноў у вас прамашка.

Пра тое, што вы, "господин", поўнасцю некампетэнтныя ў пытаннях школы ці проста хочаце выдаць жаданае за рэальнае, сведчыць і ваша выказванне: "В то время, когда не было школ белорусских, не было и русских", калі абвінавачваеце Гайсёнка і Гілевіча за неіснуючы "учебник по истории для 5—11-х классов общеобразовательной школы" і інш.

Не ў ладах вы і з веданнем міжнароднага дакумента, які тлумачыце на свой манер. Пасля няправільнай яго назвы вы пішаце: "Не является ли насильственная сплошная белорусизация школ грубейшим нарушением прав человека — детей и их родителей, которых лишили права свободного выбора языка обучения?" Дык вось, ва "Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека" (так на самай справе ён называецца), прынятай 10 снежня 1948 года Генеральнай Асамблеяй, у артыкуле 26, п. 3 абвяшчаецца: "Бацькі маюць права прыярытэту ў выбары **віду адукацыі** (падкр. намі. — **А.Л.**) для сваіх малалетніх дзяцей". Не наводзьце цень на пляцень: гаворыцца пра від адукацыі, а не пра мову навучання. Але скажыце, паклаўшы руку на сэрца: у якім горадзе для рускіх у нас няма рускіх школ? Для іншых прадстаўнікоў краін СНД няма, няма і беларускіх у Расіі. Чаму вы, "господин", як народны дэпутат Беларусі не выступаеце за выкананне закона аб дзяржаўнасці беларускай мовы? Не выконваеце і вы — вось гэта нонсенс. Ні ў адной замежнай краіне, акрамя Беларусі, вас не ўзялі б на дзяржаўную службу без ведання дзяржаўнай мовы. А ў нас большая палова дэпутатаў не валодае ёю. Аб якой "насильственности" можа ісці гаворка, калі на вывучэнне дзяржаўнай мовы адведзена 10 (!) гадоў, згодна з законам?

Дазвольце вам напомніць у гэтай сувязі справядлівыя словы не заўсёды справядлівага правадыра рускай рэвалюцыі, сказаныя ім у 1922 годзе, каб абараніць "расійскага іншародца ад нашэсця таго сапраўды рускага чалавека, велікарасашавініста, па сутнасці нягодніка і насільніка, якім з'яўляецца тыповы рускі бюракрат". Ленін патрабаваў, дарэчы, "увесці найстражэйшыя правілы адносна ўжывання нацыянальнай мовы ў нацыянальных рэспубліках, што ўваходзяць у наш саюз, і праверыць гэтыя правілы асабліва скрупулёзна".

Многія ў нас так закамплексаваліся, так асімляваліся ў сувязі з "насильственным" увядзеннем адзінай дзяржаўнай рускай мовы, што самі не заўважаюць парушэнняў тых жа правоў чалавека, робяць выступленні, "оскорбляющие национальное достоинство". Артыкул "Вы не правы!" — таму пацвярджэнне. Яго аўтар і яму падобныя не хочуць заўважаць тых, хто ўжо прачнуўся ад вялікай спячкі, хто стаў беларусам у душы.

Так, у нас сапраўды нельга было ажыццявіць бацькам-беларусам права выбару школы з беларускай мовай навучання. У 1988 годзе я з ладнаю групай бацькоў з мікрараёна Уручча г.Мінска абіваў парогі дзяржаўных устаноў, каб дазволілі адкрыць хаця б адзін беларускі клас для нашых дзяцей. Дарэмна. Аддаў дачку ў рускую школу. Толькі праз год села яна за парту другі раз у першы клас, але з беларускай мовай навучання. Цяпер я атрымаў кватэру ў мікрараёне Малінаўка. Але зноў для дачкі няма магчымасці ажыццявіць "права свободного выбора языка обучения", таму што ўсе шостыя класы ва ўсіх школах тут з рускай мовай, "господин" Сорокин.

Невядома, чаму вы шуміце? Ды яшчэ абражаеце сумленнага чалавека, народнага пісьменніка, чые вершы дзеці павінны вучыць на памяць, прафесара, які мае вялікі вопыт працы ў вышэйшай школе. Ці да твару вам (а можа, да твару?) брудныя выразы пары таталітарызму, якімі карыстаецеся: "лицемерно заявлять", "откровенное лицемерие", "бред одинокого историка с агрессивно-националистическим уклоном сознания", "националистический беспредел" і інш.? Прабач, Божа, што паўтараю гэты бруд.

У самым канцы вы заклікаеце расправіцца са сваімі палітычнымі апанентамі, як у часы сталінізму, пры дапамозе міліцыі, сродкаў масавай інфармацыі, усяго грамадства.

Пакуль мы яшчэ не дайшлі да асвятлення вамі пытанняў гісторыі, нарэшце хачу сказаць аб галоўным. Яно датычыцца ўсіх нас. Хочацца, каб мяне зразумелі. Ведаю, што не ўсім гэта пад сілу адразу. Тое, аб чым буду гаварыць, праўда, але горкая, якую не ўсе любяць. Адчуваю, колькі на мяне можа выліцца за яе праклёнаў ад зняверaных і зласліўцаў.

Мы — хворыя. Я — таксама. Але ў адрозненне ад іншых ведаю пра гэта, таму даўно лячуся сам і маю такія-сякія вынікі. Дыягназ? Думаю, што гэтая хвароба яшчэ не мае назвы. Яна замоўчвалася ў СССР, хаця за мяжою аб ёй даўно гавораць. Здалёку бачыцца лепш. Цяжка яе заўважыць сярод аднолькавых, хворых. Калі змясціць у адзін дом усіх нованароджаных з нейкім адным атавізмам і ізаляваць ад свету, то ім будуць здавацца хворымі нармальныя людзі. Дарэчы, так і было ў нас. Салжаніцын, Сахараў... Іх і многіх іншых, што вылучаліся сярод нас, бачылі нашу хваробу, мы прымушалі сілаю лячыцца ў псіхушках, трымалі ў турмах, расстрэльвалі, выганялі за мяжу. Савецкая ідэалогія ўбівала нам у галаву, што мы самыя справядлівыя, багатыя і шчаслівыя, а капіталізм — загнівае...

Асаблівы лёс напаткаў беларусаў. Акрамя ўсяго іншага нас палячылі, нямечылі і нарэшце нас абрусілі. Асабліва гэты працэс узмацніўся ў XVIII стагоддзі пасля так званых трох падзелаў Рэчы Паспалітай, куды ўваходзіла на федэратыўнай аснове беларускае гаспадарства.

Дарэчы, нашай хваробе спрабавалі даць назву: манкуртства, асіміляцыя, нацыянальны нігілізм... Мусіць, лепш падыходзіць — беларусафобія. Fobas, fobija з грэчаскай мовы азначае "страх", "боязь", з англійскай — "агіда". Страх, боязь трымацца беларушчыны, агіда да яе. Аказваецца, што французская мова дае тлумачэнне фобіі як форме неўрозу з пакутлівым страхам чаго-небудзь (М.Бусел). На нашу думку, беларусафобія — гэта хвароба з разнавіднасцей неўрозу, якая характарызуецца маніяй страху трымацца беларускасці, што выклікана гвалтоўнымі асімілятыўнымі дзеяннямі (I ступень); іншы раз страх перарастае ў агіду, нянавісць да ўсяго беларускага (II ступень); найбольш небяспечнай формай хваробы з'яўляюцца розныя віды агрэсіўнага, ваяўнічага вялікадзяржаўнага рускага шавінізму.

Безумоўна, права поўнага вывучэння і асэнсавання хваробы пакінем псіхолагам, псіхатэрапеўтам, неўрапатолагам, сацыёлагам.

Для сябе я даўно ўсвядоміў, што не павінен адразу спрачацца, услых здзіўляцца на першы погляд неверагоднаму, нязвыкламу, што не ўкладваецца ў ранейшыя савецкія прадстаўленні. Гэта адзін са шляхоў вылечвання.

А цяпер давайце паразважаем аб гісторыі. "Господин Некрасов" у "Дискуссионной трибуне" прызнае, што тысячагадовая гісторыя беларускага народа раней асвятлялася неаб'ектыўна і ненавукова, Сарокін аб гэтым зусім не ўпамінае. Першы нават робіць няўдалую спробу вызначыць "истинные корни русофобии". Ні адзін, ні другі не сумняваюцца ў наяўнасці гэтай з'явы. Я ўпэўнены, што носьбітамі гэтай хваробы не з'яўляюцца ні стваральнікі новых падручнікаў па гісторыі Беларусі, ні аўтары і рэдакцыя часопіса "Пралеска", ні нават аўтар артыкула "О русском империализме и его опасности". Нельга атаясамліваць нянавісць да рускага імперыялізму з рускім народам.

Уся справа заключаецца ў праўдзе. Што з ёю рабіць? Даваць яе дзецям ці не? Ранейшыя падручнікі па гісторыі хлусілі. На іх выхаваны тысячы ні ў чым не вінаватых грамадзян Беларусі, у тым ліку і сотні гісторыкаў для школ, пра якіх вы згадваеце, "господин Сорокин". Вас палохае праўда, і вы думаеце, калі яе будуць ведаць, то гэта шлях да русафобіі. Хлусня неабходна заваёўнікам дзеля імперскіх патрэб.

Паразважайце, няўжо праўда ў цывілізаваным грамадстве можа прывесці да грамадзянскай вайны? Ведаюць жа рускія і беларусы аб мангола-татарскім нашэсці, аб нямецка-фашысцкай агрэсіі, аднак цяпер паміж народамі ўсталявалася цеснае супрацоўніцтва і дружба.

Аўтары двух артыкулаў і ў большай ступені "г.Сорокин" маюць прэтэнзіі да гісторыкаў у асвятленні фактаў. Шкада, што "навейшы даследчык" не знаходзіць дакументаў, што пацвярджалі б, напрыклад, "самосуществование древнерусского народа" — велікаросаў, маларосаў і беларусаў. Галаслоўем тут справу не вырашыць. Вядома ж, што ў канцы X стагоддзя ідэя прымусовага аб'яднання ўсходнеславянскіх зямель не ажыццявілася. Полацк адстаяў сваю незалежнасць. І ў сярэдзіне XIII стагоддзя Навагрудак аб'яднаў беларускія землі ў Вялікае княства Літоўскае. 800 гадоў нашай сталіцай была не Масква, а толькі 200 апошніх. За тыя 8 стагоддзяў сапраўды было шмат войнаў з Масковіяй. Але ж нашы гісторыкі апавядаюць і аб войнах з Нямеччынай, Польшчай ды інш.

Уявіце сабе: калі б да нядаўняга часу беларускія землі былі пад уладай Рэчы Паспалітай, то прадбачыцца, што спадару Гілевічу на Вярхоўнай Радзе pan Sorokin па-польску даводзіў бы аб нацыяналістычным ідэалагічным тэроры. Або яшчэ прыклад. Калі б у 1410 годзе войскі Княства і Польскага Каралеўства не перамаглі ў Грунвальдскай бітве нямецкіх рыцараў, то цяпер бы нейкі genosse даводзіў бы па-германску беларускім нацыяналістам не аб "самосуществовании древнерусского народа", а аб "исконных" (спрадвечных) землях нямецкага Ордэна.

Спадароў Гілевіча, Гайсёнка і іншых самаахвярных адраджэнцаў патрэбна ўзнагародзіць, а не караць за створаную аснову новых падручнікаў па гісторыі, геаграфіі. На іх вырасце новае пакаленне людзей, падобнае на сваіх прадзедаў, што баранілі незалежнасць Бацькаўшчыны, а не на сваіх бацькоў; яны будуць любіць шматпакутную Беларусь, старажытную Літву. У іх не будзе хвароб: ні беларусафобіі, ні русафобіі. А тыя тэхнічныя і некаторыя факталагічныя недахопы новых падручнікаў з цягам часу адшліфуюцца.

Артыкул "Вы не правы!" здзіўляе некампетэнтнасцю высноў, элементарнай некультурнасцю, ненавуковасцю і неаб'ектыўнасцю. Галоўнае, што ў гэтым аўтар абвінавачвае сваіх кампетэнтных апанентаў: заслужаных вучоных, вядомых грамадскіх дзеячаў. Чамусьці Сарокін адмаўляе ў самабытнасці беларускай культуры і не бачыць "в этом ничего унизительного", не думае, што падобнай некультурнасцю раніць нацыянальны гонар беларусаў. Не валодае элементарнымі паняццямі "этнаграфічныя і дзяржаўныя межы". На гэтай падставе прыпісвае БНФ "имперские амбиции" і неіснуючыя заклікі да падзелу зямель. А вось імперскую Маскву выстаўляе такой добрай, якая з лёгкасцю дорыць этнаграфічна-беларускія землі беларусам... і не толькі ім (пра апошняе змоўчвае).

Адумайцеся і згадзіцеся, "г. Сорокин", што ствараць парламенцкую камісію "по всестороннему изучению фактов разжигания национальной розни и ненависти к России и русскому народу", як вы прапаноўваеце, без удзелу Камісіі па адукацыі, культуры і захаванню гістарычнай спадчыны — недэмакратычна і несправядліва. Бо, зразумела, што яна будзе складацца толькі з вашых аднадумцаў. А вось справядліва было б на самай справе стварыць незалежную міжнародную камісію са спецыялістаў-беларусазнаўцаў з замежных краін па пытаннях русафобіі і беларусафобіі. Тут вы як дэмакрат павінны згадзіцца. Хаця паняцце "дэмакратыя" вамі і вашымі аднадумцамі разумеецца не так. Недэмакратычна пасля нацыянальна-беларускага генацыду 30—50-х гадоў і амаль 70-гадовай русіфікацыі праводзіць рэферэндумы аб дзяржаўнасці мовы. У гэтай сувязі, я лічу, будуць і недэмакратычнымі цяпер любыя выбары ў нас. У нас выбіты нацыянальна-дэмакратычныя сілы, прагрэсіўная праслойка нешматлікая, перыферыя, асабліва вёска, яшчэ спіць, пануе беларусафобія, масавыя сродкі інфармацыі знаходзяцца ў руках савецка-бюракратычнай улады. У такіх умовах сапраўдны дэмакрат не можа стаць прэзідэнтам. Хутчэй ім стане той жа, хто і вядзе рэспубліку ў тупік, або беларускі калгасны "жырыноўскі". Дэмакрат можа заняць трон толькі цудам, але ён здараецца вельмі рэдка. Апошняе было выклікана своеасаблівым паралічам дэпутатаў у сувязі са спробай перавароту ў Маскве. Тады быў дэмакрат на троне, але яго выкарысталі камуністы, каб скампраметаваць дэмакратыю і рэформы. Гэта ім удалося, бо на самай справе яны кіравалі рэспублікай пад шырмай дэмакратычных рэформ.

Дэмакраты будуць выкарыстоўваць выбары з мэтай прапаганды сваіх ідэй. Час і цярпенне, праца на карысць Бацькаўшчыны прынясуць у будучым поспех. А пакуль што будзем доўга цярпець нястачы, галечу, перажываць новыя "эксперыменты" старых правіцеляў, якія няздольны самі разабрацца ў сістэме рыначных адносін. Будуць цярпець і тыя, хто ведае, як падняць эканоміку. Але ім не хутка давераць руль беларусафобы і ўсе тыя, у каго моцна заселі ў мазгах ракавыя метастазы савецкай ідэалогіі.

Алесь ЛОЗКА,
педагог, фальклорыст.

Нет русского вопроса в странах ближнего зарубежья, а есть люди, не уважающие язык, культуру и историю тех народов, среди которых живут

Уважаемая редакция "Народной газеты"!

Зачем вы публикуете статьи таких ярых врагов белорусской государственности, как В.Сорокин и ему подобных? От таких статей если и не был националистом и русофобом, то обязательно им станешь. Ибо белорусу эти люди говорят, что ты безродный, что у тебя и твоих предков не было ни своего государства, ни истории, и язык твой какой-то не такой, и вообще ты родился и живешь не на своей земле.

В известной статье З.Позняка я для себя ничего нового не нашел: во многих глухих селах Брянщины еще до сих пор люди говорят с белорусским акцентом, несмотря на усиленную русификацию. А вот из статьи В.Сорокина "Вы не правы!" я впервые узнаю, что все мои предки-белорусы, жившие по линии матери на Гомельщине, а по линии отца — на Могилевщине, оказывается, жили не на землях белорусов, а на землях России, которая соизволила "подарить" их белорусам. Россия всегда любила дарить чужие земли: Гомель с окрестностями — графу Румянцеву-Задунайскому, окрестности Кобрина — графу Суворову, лесные массивы в окрестностях Борисова — родственнику царствующего дома и т.д.

Сорокин и ему подобные, отрицающие существование средневековой белорусской государственности, встречаются довольно часто. Только хочется у них спросить: а как же быть с Туровским и Полоцким княжествами, а позднее и с Великим княжеством Литовским? Или в этих княжествах жили не белорусы или, по аналогии, в Киевском княжестве, называющемся почему-то Киевской Русью, жили не украинцы? Неужели "великодушные" русские отдали невесть откуда взявшимся белорусам и украинцам эти земли, а сами ушли куда глаза глядят? Что-то не вяжется здесь у вас, т.Сорокин, нет логики! И вообще, что это за стремление свести все восточные славянские народы к одному понятию — древнерусский народ? Надо уж было прихватить заодно западных и южных славян, а там, глядишь, до Адама и Евы недалеко.

Пора бы Сорокину и иже с ним понять, что история окраинных народов Российской империи фальсифицирована российскими историками. И понятно стремление этих народов воскресить правду и гордиться историей своих предков, историей своей Родины. То же хочется сказать и тем учителям-историкам, которые предпочитают не думая преподавать фальсифицированную историю Российской империи (и законспектированную еще со студенческих лет), а не историческую истину государства Беларусь.

Возмущение вызывает и утверждение В.Сорокина о том, что белорусов освободили от фашизма только русские. По какому праву вы, В.Сорокин, уцелевший в мясорубке кровавой борьбы двух идеологизированных жестоких режимов, отбрасываете вклад в это освобождение самих белорусов, в том числе и моего погибшего под Жлобином отца?! К сведению В.Сорокина: потери белорусов в этой войне в процентном соотношении несоизмеримо выше, чем русских. Не мешало бы помнить Сорокину, что победа над фашизмом была достигнута борьбой всех наших и зарубежных народов, и выделять в этой борьбе только один русский народ — кощунственно. Вряд ли вас поймут узбеки, грузины, армяне и др.

Вообще, послушаешь таких сорокиных и получается, что за белорусов русские и воевали, и строили, и землю им дарили, а они, неблагодарные, почему-то к символике своих предков стремятся.

Я думаю, что статья В.Сорокина "Вы не правы!" помогает лучше понять и эстонцев, и казахов, и другие народы ближнего зарубежья, понять, что нет русского вопроса в странах ближнего зарубежья, а есть, простите, сорокины, не уважающие язык, культуру и историю тех народов, среди которых они осели.

С уважением

Ю.РОМАНОВСКИЙ.

г.Борисов.

Наш язык стоит на одной ступени с русским и другими языками Европы

Пишет вам рядовой житель многострадальной Беларуси, и специально на русском языке, так называемом великом и могучем, так как наши "уважаемые" народные депутаты Беларуси не поймут и не станут читать, что написано на нашем, "туземном" языке. Как им не стыдно, этим так называемым народным депутатам, оскорблять то государство, в котором живешь и которое тебя кормит, одевает? Я имею в виду статьи Валентина Сорокина и Игоря Некрасова, которые опубликованы в "Народной газете" за 27 апреля 1994 года.

У меня есть конкретные вопросы к т. В.Сорокину:

1. Пусть "уважаемый депутат" назовет хоть одну газету на белорусском языке, которая бы выходила в России при поддержке правительства. А у нас сколько выходит этих газет при поддержке Совета Министров Беларуси?

2. Пусть "уважаемый депутат" Сорокин назовет хоть одну радиопередачу или телепередачу на белорусском языке, которая бы выходила на ТРК "Останкино" или "Россия", а у нас сколько этих передач?

3. Т.Сорокин говорит о том, что никто не выступает против государственности Беларуси. А он сам? Я имею в виду его выступление против нашего герба и флага. Почему он не выступает против трехцветного флага России?

4. Почему т.Сорокин не говорит о том, сколько раз и царское правительство, и "великие светлые головы — коммунисты" [illegible] язык? И теперь, когда дети начали только-только приобщаться к изучению нашего белорусского языка, тут же удар ниже пояса — не пущать. Если т.Сорокину и К° не нравится изучение белорусского языка, то уж, извините за грубость, надо ему подумать об элементарных правилах культуры. А дети, которые будут учиться на белорусском языке, поймут, что наш белорусский язык стоит на одной ступени с русским и другими языками Европы. А отрекаться от языка той земли, на которой живешь, не стоит, это говорит о том, какой человек представляет русскую нацию, и еще раз доказывает, что в русском народе (большей его части, по моему мнению) пышным цветом расцветает, еще по Ленину, "великодержавный шовинизм". Если человек, который защищает честь России, — это патриот, то человек, который защищает честь своей Родины, — это националист, так по мнению т.Сорокина и ему подобных. А если говорить о нашем правительстве, я имею в виду и "нашу телезвезду" последних месяцев В.Кебича, то он обещал выучить белорусский язык и разговаривать на нем, но, оказывается, его слова ничего не стоят. Очень большое неуважение к нашему народу, его культуре и у других деятелей нашей власти. У меня есть предложение: все выступления наших руководителей, если они происходят на русском языке, давать синхронный перевод на белорусский язык.

С уважением к вам

Иван СЕВАСТЬЯНОВ,
пенсионер.

г.Бобруйск.

ЗАМЕЖЖА

Усім машынам — машына

Малым залатым медалём на 22-м Міжнародным салоне вынаходак, новых тэхналогій і прадуктаў, які праходзіў у Жэневе, адзначаны інтэлектуальны праграмныя сістэмы пад агульнай назвай "Машына-вынаходніца", распрацаваныя расійскімі і беларускімі вучонымі.

Гэта шосты залаты медаль "Машыны-вынаходніцы" на буйнейшых сусветных выстаўках за пяцігадовую гісторыю праекта. З навукова-даследчай лабараторыяй вынаходніцкіх машын (НДЛВМ) супрацоўнічаюць сусветна вядомыя карпарацыі "Кодак", "Ксеракс", "Джэнерал мотарс" і многія іншыя. Шкада толькі, што вельмі цікавыя распрацоўкі, якія знаходзяць шырокае прыме-нение на Захадзе, не прыцягваюць увагу прамысловасці СНД. Эрэшты, гэты прабел, магчыма, будзе ўхутым часе ліквідаваны — у сярэдзіне мая ў Мінску пройдзе выстаўка "Сродкі аўтаматызацыі", на якой НДЛВМ прадставіць для інжынераў, вучоных і вынаходнікаў з СНД сваё апошнія распрацоўкі.

Белінфарм.

А што ў суседзяў?

Перадзел флоту пад сумненнем

На думку намесніка міністра абароны Украіны Івана Біжана, расійскі бок накшуць што не гатовы да рэальнага пагаднення аб пэатапным урэгуляванні праблем Чарнаморскага флоту. Размова ішла аб часовым знаходжанні расійскай часці ЧФ у Крыме, лічыць ён. Істотныя рознагалоссі ўзніклі пры абмеркаванні берагавой інфраструктуры. У выніку перагавораў былі ўзгоднены колькасныя даныя пласцавору флоту. На 20 красавіка 1994 года агульны састаў ЧФ склаў 833 адзінкі. Мяркуецца, што ў ВМС Украіны з іх павінны паступіць 164 адзінкі, у ВМС Расіі — 669.

За тысячну адходаў

Кабінет міністраў Украіны прыняў пастанову аб упарадкаванні ўвозу ў рэспубліку і транзіту праз яе тэрыторыю адходаў і другаснай сыравіны. Для гэтых мэт у абавязковым парадку павінен быць атрыманы дазвол Мінпрыроды Украіны. Зацверджаны пералік рэчываў і матэрыялаў, увоз якіх забаронены наогул. Парушальнікі будуць прыцягвацца да адказнасці згодна з дзеючым у рэспубліцы заканадаўствам.

Укрінфарм—Белінфарм.

Накануне события

В честь иконы Матери Божьей Будславской

Завтра в Минске и области начинаются грандиозные празднества католических верующих. Они связаны со знаменитой чудотворной иконой Матери Божьей, которая почти четыре столетия сохраняется в храме местечка Будслав Мядельского района.

Как сообщил редакции настоятель минского костела святых Симона и Елены ксендз-магистр Владислав Завальнюк, создана копия иконы, которую в наши дни освятил находившийся в Белостоке папа римский Иоанн Павел II. С этим образом состоится торжественное шествие духовенства и верующих.


Три дня с 15 по 17 мая процессии и праздничные богослужения будут проводиться в столице, а затем икона отправится в путешествие. В мае — июне намечено посетить 46 городов и сел Минщины, где процессии верующих будут передавать святой образ из рук в руки.

1—2 июля в Будславе состоится большой праздник, на который традиционно съедется множество паломников, а оттуда копия иконы Матери Божьей Будславской вернется в Минск в костел святых Симона и Елены, где навсегда останется в специально сооруженной часовне.

Сергей КРАПИВИН.

Кроссворд

Ф.БЕЛЯЕВ (г.Жодино)



